65. Сінчук І. Пра Цітова, пячаткі і Радзівіла // Спадчына, 1994. № 6. С.140-141. [Рэцэнзія].
66. Сінчук І. Трэцяя heraldica Цітова: Цітоў А. Геральдыка беларускіх местаў (XVI – пачатак XX ст.). Мн., 1998 – 287 с. [Рецензия] // Спадчына, 2000. № 5-6. С. 242-254.
67. Сінчук І. Цітоў А. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі (ілюстраваны курс лекцый). Мн., 1999 – 176 с. // Гістарычны альманах. Т.9. Гародня, 2003. С.244 [Анатацыя].
68. Зайцева О.Е., Синчук И.И., Филонов Б.О. Пломбы XVI-XVIII вв. из Дисны и Друи // Шестая Всероссийская нумизматическая конференция. Санкт-Петербург, 20-25 апреля 1997 г. Тезисы докладов и сообщений. Спб., 1998. С. 115-117.
69. Штыхаў Г., Сінчук І. Пломба // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.5. Мн., 1999.
70. Sintchouk I., Filonov B. About several numismatic subjects from the physico-chemical point of view // Zbornik radova 3. Međunarodnog numizmatičkog kongresa u Hrvatskoj. 11.-14. Listopada 2001. Hotel "Histria" – Pula – Hrvatska = Proceedings of the 3rd international numismatic congress in Croatia. October 11th-14th, 2001. Hotel "Histria" – Pula – Croatia. Pula, 2002. S. 201-213.
71. Sintchouk I. Additional history disciplines: Programme for postal tuition students in museum management studies = Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны: Праграма для студэнтаў завочнага аддзялення спецыялізацыі "музеязнаўства". Minsk, 1998 - 38 p.
72. Синчук И.И. Белорусский биографический справочник как исторический источник // Гісторыя Беларусі: Новае ў даследаваннях і выкладанні. Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. 27 сакавіка 1999 года. Мн., 1999. С.183-185.
73. Синчук И.И. Новые белорусы в свете антропонимики // Вестник Брестского государственного технического университета: Гуманитарные науки, 2003. № 6. С. 27-30.
74. Синчук И.И. Сельское кладбище под Кобрином как источник по этнической истории // Исторические, социокультурные и экономические аспекты воссоединения белорусского народа: Материалы межвузовской научно-практической конференции преподавателей, аспирантов и студентов, посвященной 60-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР. 26-27 октября 1999 г. Брест, 2000. С. 62-64.
75. Синчук И.И. Эволюция набора личных имен в XX в. (на примере студентов и преподавателей минских вузов) // Onomastica. R.XLIII. Kraków, 1998. S. 223-247.
76. Синчук И. Иван да Марья, Ян и Мария // Загароддзе-3: Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі "Палессе ў XX стагоддзі". 1-4 чэрвеня 2000 г., Беласток. Мн., 2001. С. 36-44.
77. Синчук И.И. Несвиж 1926 г.: Антропонимия верхних страт населения города // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. Матэрыялы рэспуб. навук. канф. У 4 ч. Ч.1. Гродна, 2003. С. 297-301.
78. Синчук И.И. Несвиж: Фамилии административного центра и фамилии сельской местности // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. Матэрыялы рэспуб. навук. канф. У 4 ч. Ч. 1 Гродна, 2003. С. 302-305.
79. Синчук И.И. Экономическая активность белорусских носителей фамилий с формантом -ук/-юк // Загароддзе-1: Матэрыялы Міждысцыплінарнага навуковага семінара па пытаннях даследавання Палесся (Мінск, 19 верасня 1997 г.). Мн., 1999. С. 80-84.
80. Синчук И.И. Восприятие этнической окраски фамилий // Информационный бюллетень Ассоциации "История и компьютер" / Специальный выпуск бюллетеня. Тезисы докладов и сообщений V конференции Ассоциации "История и компьютер". Звенигород, 28-30 марта 1997 г. Мн., 1997. Март. № 21. С. 114-116.
81. Синчук И., Петраковский В. Об интерпретации возрастной структуры еврейского населения Российской империи конца 19 века // Материалы одиннадцатой ежегодной международной междисциплинарной конференции по иудаике. Ч. 2. М., 2004. С. 382-393.
82. Синчук И.И. Об этническом обосновании присоединения новых земель к БССР в 1939 г. // Проблемы совершенствования политической системы Беларуси на рубеже XX-XXI веков: Материалы научно-практической конференции 6-7 июня 2001 года. Брест, 2001. С. 224-229.
83. Сінчук І. Паляшукі, тутэйшыя, мясцовыя ды іншыя // Biuletyn historii pogranicza, 2004. № 5. С. 159-167 [Рэцэнзія].
84. Синчук И.И. Политика активного экспорта элиты – черта советского государства времени территориальной экспансии // Вестник Брестского государственного технического университета: Гуманитарные науки, 2002. № 6. С. 82-84.
85. Грималаускайте Д., Синчук И. О термине летувисы белорусской историографии 1990-х гг. // Вестник Брестского государственного технического университета: Гуманитарные науки, 2004. № 6. С. 45-47.

УДК 730.32

***Стралец М.В., Паталкоў Ю.В.***

# КНІГА ГРАМАДЗЯНСКАГА ПАЧУЦЦЯ

У Беларусі робіцца шмат добрага для развіцця нацыянальнай культуры. З пачуццём гонару ўспрымаецца адраджэнне гістарычнай памяці народу. Архітэктурныя і скульптурныя помнікі, фестывалі, тэатральныя і кінапрэм'еры, упрыгожванне знешняга выгляду гарадоў і вёсак. Прыкладаў падобнага культурнага дзеяння можна прыводзіць шмат. І гэта вельмі добра.

Вядома, што у згаданым накірунку ёсць і невырашаныя праблемы. Таму кожнае выступленне у абарону культуры сёння ў асаблівай ступені значна і неабходна. Прыкладам зацікаўленага грамадзянскага роздуму (канструктыўнага і глыбока прафесіянальнага) успрымаецца кніга І. І.Сінчука «Клады Беларуси: законодательство и практика"(Мінск, 2003. - 56 с.). У ёй пастаўлена пытанне аб неабходнасці наступных рашучых крокаў па выяўленню і асабліва гаспадарскаму выкарыстоўванню кладаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі.

Сярод недахопаў пазначаны такія:

- законы ў адносінах кладаў, існуючыя у РБ, часта супярэчаць адзін аднаму; гэта пазбаўляе іх дзейнасці;
- дзяржаўныя музеі часам утойваюць клады, якія знаходзяцца ў іх распараджэнні, ад навуковай грамадскасці;
- дэпартамент Міністэрства культуры РБ па ахове гістарычнай спадчыны не мае ў сваім саставе аніводнага спецыяліста па археалогіі і нумізматыцы; у выніку гэтага існуе ілюзія дзейнасці, але няма самой дзейнасці;
- артыкулы Канстытуцыі РБ, гарантуючыя права грамадзян на свабоду творчасці і права на атрыманне грамадзянамі

інфармацыі ад дзяржаўных устаноў, выконваецца не заўсёды.

Усе недахопы, пералічаныя вышэй, пацверджаны ў кнізе "Клады Беларусі ..." выразнымі фактамі. Звернемся да некаторых з іх.

У парадку эксперымента І. І.Сінчук здаў пад распіску ў прыёмную Міністэрства культуры РБ клад манет XVII стагоддзя. У выніку атрымалася наступнае: абумоўленае законам узнагароджанне, якое павінна выдавацца за выяўленне і пастаноўку на ўлік новага помніка гісторыі культуры, не выплачана, хоць ведамственнай інструкцыяй вызначаны дзесяцідзённы тэрмін выплаты ўзнагароджання з моманту ацэнкі.

Аўтар кнігі звярнуўся ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры з просьбай прадставіць яму картатэку кладаў, якія маюцца ў распараджэнні музея, але картатэка прадстаўлена яму не была. Між тым, у музеі захоўваецца значная колькасць /каля сотні/ неапублікаваных кладаў. Музей, як вядома, павінен выконваць ролю нацыянальнага метадычнага музейнага цэнтра, а гэта значыць, не абмяжоўваць доступа спецыялістаў-даследчыкаў да матэр'ялаў.

І. І.Сінчук звярнуўся з шэрагам пытанняў пра клады ў Міністэрства культуры РБ, але адказу на гэтыя пытанні /яны прыведзеныя ў кнізе/ не атрымаў. У сувязі з гэтым можна быць пэўным, што аніводзін спецыяліст-нумізмат у музеях Міністэрства культуры не працуе і кваліфікавана адказаць на пастаўленыя пытанні папросту няма каму.

Незвычайна дрэнна выглядае сітуацыя з вывучанасцю беларускіх кладаў у плане міжнароднай кааперацыі. Апублікаваны інвентары Польшчы, Украіны, Літвы, але няма інвентара кладаў Беларусі.

Не паддаецца лагічнаму тлумачэнню існаванне адначасова двух праваздейных законаў аб узнагароджанні дзяржавай асобы, якая адшукала клад. Згодна з першым з законаў такі чалавек атрымлівае 25 % ад вартасці знойдзенага клада, згодна з другім – 50 % пры іншых роўных умовах. Тэрміны правядзення ацэнкі знойдзенага клада не вызначаны; у сувязі з гэтым узнагароджанне можа затрымлівацца да бясконцасці. Апрача таго, існуюць дзесяткі мажлівых сітуацый пры адшуканні клада, якія не прадугледжаны законам вогуле.

Па ініцыятыве аўтара ў 1991 г. Вярхоўны Савет Беларусі запрасіў Расію пра колькасць кладаў, якія з тэрыторыі Беларусі перададзены на захаванне ў Маскву ў агульнае захоўванне кладаў. Паралельна было запрошана Міністэрства унутраных спраў РБ. Міністэрства паведаміла пра 26 кладаў манет. Расія дала звесткі пра тое, што ёй з Беларусі перадана ўсяго два клады. Да таго ж, у 2002 годзе супрацоўнікі унутраных спраў РБ ужо не адшукалі ў сваіх архівах звестак пра перадачу беларускіх кладаў у Расію. Але фотакопіі адказаў 1991 г. існуюць і ў кнізе І. І.Сінчука яны апублікаваны.

Аўтар кнігі прапануе захады, якія ў стане змяніць існуючы парадак рэчаў. У прыватнасці, прапанова такая: калі на працягу вызначанага кароткага часу супрацоўнікамі клад не вызначаны і не апублікаваны ў сучасных электронных сродках інфармацыі (з улікам легенд, метралагічных параметраў, з выявай кожнай манеты), дык клад вызначаецца запрошанымі кантрактнымі спецыялістамі (у тым ліку і замежнымі) і пазней перадаецца з аукцыёна для пакрыцця выдаткаў на яго апісанне.

Клады манет павінны быць выведзены з састава адзінага дзяржаўнага фонда каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

Стварыць альтэрнатыўную музеям, выставачным залам сетку сховішчаў старадаўнасцей. Гэтыя сховішчы не мелі б экспазіцый і былі б скіраваныя толькі на захаванне артэфактаў з мэтаю прадстаўлення іх даследчыкам.

Выклікае павагу грамадзянскі пафас кнігі. Назіранні І. І.Сінчука зыходзяць з яго жадання ўнесці ўклад да канструктыўнага развіцця нацыянальнай культуры. Можа быць, кніга І. І.Сінчука не здолее вырашыць усіх праблемаў з кладамі. Але факты, абвешчаныя ў ёй, існуюць. Ігнараванне фактаў, як паказвае вопыт жыцця, - не найлепшы шлях да змянення сітуацыі на лепшае. Чытачам кнігі "Клады Беларуси:законодательство и практика" хацелася б верыць, што працэс выпрацоўкі беларускай ідэалогіі, грамадзянскі клопат аб лёсе нацыянальнай культуры прымусяць грамадства прыгледзецца да сітуацыі з кладамі і зрабіць з яе адпаведныя, каштоўныя для дзяржавы і народа, высновы.

УДК 327.01

***Стралец М.В.***

# АНАТОМІЯ ПЕРАЛОМНАГА ЭТАПА Ў ГІСТОРЫІ ГЕРМАНСКАГА ПЫТАННЯ

***РЭЦЭНЗІЯ НА ВЫДАННЕ ПЕТЕЛИН Б. В. ГЕРМАНСКАЯ ПОЛИТИКА КАНЦЛЕРА ГЕЛЬМУТА КОЛЯ 1982 – 1990 ГГ.: НАУЧНОЕ ИЗДАНИЕ. – ВОЛОГДА, 2004. – 304 С.***

Доктар гістарычных навук, прафесар Валагодскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта Барыс Валянцінавіч Пяцелін звыш чвэрці стагоддзя актыўна і мэтанакіравана даследуе найноўшую гісторыю Германіі. Рэцэнзуемая манаграфія належыць да несумненных удач навукоўцы. Ужыванне ў найменні рэцэнзіі слова «анатомія» тлумачыцца наступнымі прычынамі.

Па-першае, манаграфія Б. Пяцеліна ў сваёй змястоўнай частцы ўяўляе сабой сістэмную рэканструкцыю ключавога звяна ў гісторыі германскага пытання ў 1982 – 1990 гг. – пазіцыі кіраўніка вышэйшай выканаўчай улады ФРГ.

Па-другое, ніводная публікацыя, прысвечаная германскай палітыцы Г. Коля,не можа параўнацца з працай валагодскага навукоўцы па крыніцазнаўчай базе. «У падрыхтоўцы манаграфіі выкарыставаны архіўныя матэрыялы Фундацый Конрада Адэнауэра (ХДС) і Ханса Зайдэля (ХСС); расійскіх архіваў: АЗП РФ, РДАНГ, РДАСПГ, дакументальныя матэрыялы Гарбачоў – фундацыі, якія адносяцца непасрэдна да германскай палітыцы СССР другой паловы 1980-х гг.»(С. 4). Абсалютная большасць фактаў, якія выкладаюцца прафесарам Б. Пяцеліным, упершыню ўводзіцца ў навуковы абарот. Дарэчы, многія з фактаў такога кшталту ўключаны ў дадаткі, якія размешчаны на старонках 226-274. Гэтыя дадаткі могуць з вялікім поспехам укараняцца ў навучальны працэс у ВНУ і школах.

Па-трэцяе, пастаянна прасочваецца фундаментальна абгрунтаваная аўтарская канцэпцыя, паўсюдна адчуваюцца глыбіня і арыгінальнасць высноў і ацэнак, імкненне даказаць беспадстаўнасць тых стэрэатыпаў, якія склаліся ў гістарычнай навуцы. Паставіўшы сабе на мэце ажыццявіць комплекснае даследаванне германскай палітыкі Г. Коля, навукоўца аднолькава ўдала аналізуе яе арганізацыйна-прававы, канцэптуальны, практычны аспекты.

Пры звароце да першага аспекта аўтар канцэнтруе ўвагу на «трох стаўпах» улады: партыю, як «базіс улады»; фракцыю ў бундэстагу, як «сетку ўлады»; ведамства канцлера, як